ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №15 (120)
ВЕРАСЕНЬ 2020 ГОДА

СУСТРЭЧА

СУСТРЭЧА Ў УУС З ЗАТРЫМАНЬНЕМ

Прадстаўнікі грамадзка-палітычнай рады Віцебску Ірына Яскевіч і Хрыстафор Жаляпаў сустрэліся з начальнікам упраўленьня ўнутраных справаў Віцебскага аблвыканкаму Міхаілам Грыбам.

Размова тычылася перавышэньня службовых паўнамоцтваў з боку віцебскіх міліцыянтаў пры затрыманьнях грамадзянаў падчас мірных акцый. На сустрэчы прысутнічалі яшчэ чатыры асобы ў масках, якія не назваліся.

На размову зь Міхаілам Грыбам была запісаная і Тацяна Севярынец, але з розных прычынаў было вырашана, што яна ў будынак УУС ня пойдзе.

17 жніўня на сустрэчы прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці з кіраўніцтвам вобласьці было заяўлена, што ніякіх перашкодаў з боку міліцыі ўдзельнікам мірных маршаў чыніцца ня будзе. Нейкі час так і было, але 6 верасьня ў Віцебску брутальна, з ужываньнем гвалту, пачалі затрымліваць удзельнікаў мірных маршаў. Было вырашана даведацца, што стала таму прычынай.

Да сустрэчы прадстаўнікі рады адабралі шэсьць эпізодаў перавышэньня міліцыянтамі сваіх службовых паўнамоцтваў. Кожны эпізод з 6 жніўня па 13 верасьня быў задакумэнтаваны (фота ці відэа). Ірына Яскевіч перадала Міхаілу Грыбу дыск з запісамі. Глядзець яго той адмовіўся, папрасіў распавесьці сваімі словамі і заявіў, што разьбярэцца. Пры канцы сустрэчы прадстаўнікі рады выказалі жаданьне атрымаць пісьмовы адказ па кожным пададзеным эпізодзе.

Са словаў прадстаўнікоў рады, сустрэча была напружанай і нармальнага дыялёгу не атрымалася. Міхаіл Грыб заявіў, што масавыя мерапрыемствы несанкцыянаваныя і міліцыя вымушаная неяк рэагаваць. Але на пытаньне, ці дзеля гэтага трэба ўжываць гвалт, так і не адказаў. Даведацца, хто даў загад на гвалтоўныя затрыманьні, таксама не атрымалася.

Адразу пасьля сустрэчы супрацоўнікі міліцыі адвезьлі Хрыстафора Жаляпава ў Першамайскі РАУС, дзе на яго быў складзены адміністрацыйны пратакол паводле арт. 23.34 за ўдзел у несанкцыянаваным маршы 6 верасьня.

Амаль адначасна да Тацяны Севярынец падышлі два супрацоўнікі і ўручылі позву ў гарадзкую пракуратуру на 17 верасьня.

С. Горкі
"Віцебская вясна"

Чытайце сайт
Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

ПЕРАСЛЕД

ЗАТРЫМАНЫ ЎДЗЕЛЬНІК ШЭСЦЯ

«У Віцебску затрыманы адзін з актыўных удзельнікаў нападу на супрацоўнікаў міліцыі», – паведаміў 19 верасня на афіцыйным Тэлеграм-канале прэс-сакратар МУС Беларусі. Удакладняецца, што затрыманы «з'яўляецца сябрам моладзевага апазіцыйнага руху і сур'ёзна захапляецца фашысцкай сімволікай». Спраўдзілі, ці так гэта і за што канкрэтна затрымалі віцябляніна.

Як высветлілася, 18 верасня пад варту быў узяты 27 гадовы жыхар Віцебску Уладзіслаў Макавецкі. Ён быў змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ) да выстаўлення абвінавачання. Мужчыну падазраюць ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага арт. 364 КК (ужыванне альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка міліцыі). Абвінавачанне мусяць выставіць праз 72 гадзіны ад моманту затрымання.

Як расказала нам маці затрыманага, у кватэры Уладзіслава 18 верасня прайшоў вобшук. Яна сцвярджае, што ніякім «прыхільнікам фашысцкай сімволікі» яе сын ніколі не быў. Ён мастак-разьбяр, займаецца таксама рэканструкцыяй і аднаўленнем вайсковых артэфактаў (мячы, каскі, сякеры), частку якіх канфіскавалі падчасператрусу.

Дарэчы, Уладзіслаў Макавецкі – адзін з аўтараў найдаўжэйшай у свеце, амаль 24-метровай, драўлянай лыжкі, якую выразалі ў Беразіне.

Як кажа маці, Уладзіславу прад'явілі фотаздымак, на якім ён замахваецца на міліцыянтаў гумовым дручком падчас сутычкі на вуліцы Праўды 6 верасня. Яна запэўнівае, што яе сын не чыніў гвалту і што ніякага «нападу на супрацоўнікаў» не было.

«Ён падбег і закрыўся левай рукой, калі міліцыянт яго ўдарыў дубінкай. Дубінка ад удару адляцела. Уладзіслаў падняў яе і ўзняў над галавой, але амаль адразу адкінуў яе ўбок. Дык вось яму прад'явілі фота, дзе ён стаіць з узнятай над галавой дубінкай. Але нават на фота бачна, што ўжо паміж ім і міліцыяй вялікая адлегласць, і ён ніяк не мог прычыніць ім шкоды», – упэўненая маці затрыманага.

Наадварот, маці лічыць, што яе сын сваімі дзеяннямі хацеў перадухіліць гвалт з абодвух бакоў.

«У цяперашні час следчымі праводзяцца неабходныя мерапрыемствы для высвятлення ўсіх абставін яго супрацьпраўных дзеянняў», – паведамляе прэс-служба МУС.

З Уладзіславам Макавецкім працуе адвакат. Адсочваем сітуацыю.

Зміцер Міраш
"Віцебская вясна"

УРАДЖАЙ 2020

С ЧЕМ ВСТРЕЧАЕМ «ДАЖЫНКІ-2020»?

В мире есть понятия, ценность которых непреходяща. К ним можно отнести хлеб — древний и вечно молодой продукт человеческого труда, который всегда был и остается символом трудолюбия, благополучия и достатка. Уборка зерна всегда считалась важнейшей из сельскохозяйственных забот, о чём и рассказал председатель Витебского райисполкома Геннадий Сабынич.

— Геннадий Геннадьевич, окончание уборочной кампании по праву считается венцом крестьянского труда. Каким получился общий районный хлебный каравай в нынешнем году?

—Каждый год, закладывая в землю семена будущего урожая, мы сеем и надежду на хороший результат. Каким в итоге он будет — зависит от многих факторов. В их числе профессионализм и трудолюбие людей.

В 2020 году аграрии района уверенно превзошли рубеж намолота зерна 2014 года. Валовой намолот зерновых и зернобобовых культур (без учета кукурузы на зерно) составляет 118 тысяч тонн. Граница намолота зерна в 100 тысяч тонн преодолена Витебским районом в четвертый раз, вместе с тем валовой сбор этого года — рекордный за все время существования района, включая намолоты 1976 года (102,6 тысячи тонн) и 2014 года (104,6 тысячи тонн). Данный результат достигнут благодаря посеву зерновых и зернобобовых культур в оптимальные агротехнические сроки, повышению качества сева, соблюдению норм высева зерна. Урожайность на сегодняшний день составляет 42,5 ц/га, что на 2,9 ц/га выше результата прошлого года. Для сравнения: в 2014 году урожайность зерна в бункерном весе составила 35,6 ц/га, в 1976 — 29,4 ц/га.

— Общий успех района, конечно же, складывается из добросовестного труда каждого участника уборочной страды. Каков вклад в общий каравай Придвинья в разрезе хозяйств?

— Традиционно наибольший вклад в валовой сбор зерна внесло ОАО «Витебская бройлерная птицефабрика» под руководством Анны Норкус, намолотив 52 тысячи тонн (44% урожая Витебского района). Кроме того, наибольший удельный вес в валовом сборе зерна обеспечили унитарное предприятие «Рудаково», возглавляемое Надеждой Бухалович, также производственные участки «Полудетки», руководитель Анатолий Лисовский, «Вымно» под руководством Михаила Дудника (27,1 тыс.тонн или 23%), ПК «Ольговское», директором которого является Николай Леошко (9,3 тыс.тонн или 7,9%).

— Кто в период нынешней страды оказывал району помощь кадрами, техникой?

— Ежегодно на помощь сельскохозяйственным предприятиям приходят и районные, и городские организации, которые не остались в стороне и в 2020 году. Это такие предприятия, как «Витебское АТП мелиоводхоз», «Гордормост», «Витебский ДСК», «Спецавтобаза г.Витебска», «ЖРЭТ г.Витебска», «Витебский Зеленстрой», ВГУ имени П.М.Машерова. Всего в 2020 году на весенне-полевые работы в сельскохозяйственные предприятия района были дополнительно привлечены 16 трактористов-машинистов и водителей автомобилей, 5 тракторов и 4 грузовых автомобиля; на уборку урожая — 19 трактористов-машинистов и водителей автомобилей, 7 тракторов с прицепами и 5 грузовых автомобилей.

— Геннадий Геннадьевич, наш район славится своими трудолюбивыми людьми. Назовите имена и фамилии тех, кто в нынешнем сезоне отличился во время уборочной кампании?

— Особую гордость в текущем году район испытывает за передовиков на уборке урожая. Это экипаж комбайнеров ОАО «Витебская бройлерная птицефабрика», намолотивший 1233 тонны на КЗС-10К в составе Валерия Альшаникова и Алексея Котова, комбайнеры УП «Рудаково» Валентин Ященко (3213 тонн, New HollandCR-9.80), Николай Шушкевич (3123 тонны, New HollandCR-9.80), представители ОАО «Витебская бройлерная птицефабрика» Александр Альшаников (2592 тонны, КЗС-1218), Евгений Кухарев и Алексей Кротиков (3456 тонн, New Holland-880). Из водителей необходимо отметить ежегодных призеров областного соревнования дуэт отца и сына Черногузовых из УП «Рудаково».

— Среди лидеров жатвы немало представителей молодежи. Какие меры предпринимаются в районе, чтобы молодые люди оставались трудиться на своей малой родине?

(працяг на стар. 2)

УРАДЖАЙ 2020

(пачатак на стар. 1)

— Для закрепления молодежи в сельском хозяйстве предприятиями района осуществляется строительство жилья (в настоящее время ведут строительство одноквартирных жилых домов СУП «Липовцы» и УП «Рудаково»); обеспечена достойная заработная плата (в среднем по району за январь-август она составила 1069,7 рубля); ежегодно проводятся соревнования среди молодых работников, занятых на весенне-полевых работах, кормозаготовке, уборке урожая и осенне-полевых работах, для стимулирования и заинтересованности в труде. Так, ежегодными призерами не только районных, но и областных соревнований становятся Евгений Кухарев (ОАО «Витебская бройлерная птицефабрика») и Александр Черногузов (УП «Рудаково»).

— Чем Витебский район привлекателен сегодня для инвесторов? Какие интересные инвестиционные проекты удалось реализовать в последние годы и что будет реализовано в ближайшие?

— Витебский район в первую очередь привлекает инвесторов расположением, близостью к городу, наличием инфраструктуры. Среди недавних инвестиционных проектов следует отметить строительство открытым акционерным обществом «Витебская бройлерная птицефабрика» зерноочистительно-сушильных комплексов вблизи г.п.Сураж, д.Курино, «Яновичи», строительство современного молочно-товарного комплекса «Яновичи». Кроме того в 2020-2025 годах планируются строительство участка убоя и переработки крупного рогатого скота вблизи д.Тригубцы (ОАО «Витебская бройлерная птицефабрика»), строительство молочно-товарного комплекса в н.п. Курино (ОАО «Витебская бройлерная птицефабрика»), установка линии по производству сухих каш (ООО «БелфудПродакшн»), установка производственной линии по производству и фасовке пеллет (ООО «ГринФорестЭнерджи»), создание предприятия по производству пеллет (ООО «Эко Пил»).

Елена ЧАПЛЕВА
"Жыццё Прыдзвіння"

СТУДЭНЦКІ АТРАД

ЗАРПЛАТА – ДО 14 РУБЛЕЙ В ДЕНЬ

Прибавилось рабочих рук и на картофельных угодьях на производственном участке «Рудаково» унитарного предприятия «Рудаково». Уже вторую неделю здесь помогают убирать второй хлеб учащиеся обособленного структурного подразделения «Аграрный колледж учреждения образования Витебская ордена „Знак Почета“ государственная академия ветеринарной медицины».

По словам заместителя директора по воспитательной работе агроколледжа Татьяны Семеновой, традиционно первые осенние месяцы для учащихся проходят не в аудиториях, а на полях хозяйств. Те, у кого нет серьезных ограничений по здоровью, в одночасье дружно меняют повседневную обувь на резиновые сапоги и отправляются на картошку. Для многих из них «овощной семестр» — своеобразное продолжение каникул, поэтому они радуются. Есть и такие, кто немного ворчит, мол, зачем нам подобная практика, но все равно работает старательно. Спустя годы, именно эти осенние поездки будут вспоминаться как самые веселые дни.

Работают учащиеся третьего курса в две смены. В день нашего приезда отряд из трех групп убирал картофель сорта Скарб белорусской селекции. Как отметила агроном-овощевод хозяйства Татьяна Спасибенок, урожайность второго хлеба в этом году хорошая. Только на полях, где вырастили Скарб, собирают 370 — 380 центнеров с гектара. В день учащиеся агроколледжа загружают по четыре единицы техники. На отвозке задействованы механизаторы хозяйства Максим Бутанов и Руслан Суровец.

— Довольны мы не только валом картофеля, но и его качеством. Посмотрите, какие хорошие клубни выросли, такими приятно наполнять ведра, — отмечает Татьяна Александровна и в подтверждение своих слов берет с одной из грядок несколько картофелин, — все они как на подбор — правильной формы и достаточно крупные. Всего нам предстоит убрать 50 гектаров картофеля.

Молодежь работает строго по графику, подвоз и отвоз организован хозяйством. Для каждого из ребят участие в уборке корнеплодов — возможность получить хорошую прибавку к стипендии. С каждым учащимся заключен договор. Средний заработок за день составляет 12 — 14 рублей. Студотряду обеспечены достойные и безопасные условия труда. Все это стимулирует к лидерству и здоровой конкуренции. В день нашего приезда задавали тон Александр Аблецов и Иван Изепченко, не отставали от них Денис Яночкин, Максим Нестеренко и Дмитрий Шевнев.

Собранный учащимися урожай поступит на пункт сортировки, где бригада работников отсортирует семенной картофель от продовольственного и направит клубни в хранилище.

Светлана ЛЮБОЧКА
vitbichi.by

ТУРЫЗМ

БЕЛАРУСЬ ЧАКАЕ ХВАЛЯ ТУРЫСТАЎ

Вядомы беларускі эксперт у галіне турызму у гутарцы з карэспандэнтам «Салідарнасці», Лілія Кобзік распавяла, якой яна бачыць будучыню Беларусі.

У нас падкрэслена мірны пратэст. У яго шмат у чым жаночы твар. Ён абсалютна не брутальны. Нават у дзень інаўгурацыі мы бачым жарты ў Інтэрнэце, у сацсетках, мемы, людзей у каронах.

Але адчуванне пераменаў лунае ў паветры. І ўлады гэта таксама адчуваюць і разумеюць, што перамены ідуць.

Беларусы хочуць мірных пераменаў. І яны прыйдуць. Пытанне толькі ў тым, як хутка. Нельга з дакладнасцю сказаць, што гэта здарыцца, да прыкладу, да Новага года. Але яны будуць. І Беларусь стане дэмакратычнай дзяржавай.

Мы пэўную лінію ўжо перасеклі. І таму грамадства не вернецца. Зладзіць тут Паўночную Карэю, я думаю, немагчыма. Венесуэлу? Можна, але як надоўга?

— Галоўнае ж у тым, што мы назіраем цяпер чарговы этап станаўлення нашай нацы. Гэта, напэўна, важней таго, калі ж наступяць перамены. Бо ў гістарычным вымярэнні — год, два, нават пяць — гэта не так і шмат.

Зараз мы праходзім свой шлях да Беларусі. У 90-х наша Адраджэнне доўжылася некалькі гадоў, але колькі людзі паспелі зрабіць і дасягнуць.

І што б ні адбывалася сёння ў палацах і на вуліцах, што б ні здарылася ў жніўні гэтага года, гісторыя рассудзіць усіх нас.

— Калі Беларусь стане дэмакратычнай, адкрыецца для астатняга свету, нас чакае эфект "вау". Пакуль у нас неспакойна, у нас вуліца. Але калі ўсё адкрыецца, у нас будзе турыстаў не праціснуцца.

Пасля такіх падзей, пасля двух дзясяткаў гадоў своеасаблівага шляху развіцця, краіна адкрываецца. Гэта будзе выбух цікавасці да нас, Калі казаць пра турызм. Паглядзець, што за людзі тут жывуць. А ў нас будзе столькі гарадскіх легенд, столькі знакаў...

Нашы вуліцы, архітэктура, яны набываюць новае гучанне. І справа не толькі ў рэвалюцыі. Горад, краіна адкрываюцца для свету з новага боку.

Я думаю, што вялікая хваля будзе на пачатковым этапе, а далей трэба будзе ўключаць праграмы. А яны ёсць, мы не першыя. Уся Усходняя Еўропа так падымалася.

Мы ж усё яшчэ не прайшлі працэс дэкамунізацыі. Вуліцы ў нас якія, помнікі. У нас усё яшчэ дзейнічаюць розныя парады. Мы да гэтага часу застаемся астраўком сацыялізму.

Што ў нас зараз адбываецца? Мы выбіваецца з гэтага сацыялізму, камунізму. І ўвесь гэты сацыялізм спрабуе захавацца. Колькі яшчэ пратрымаецца сістэма?

Я думаю, што гарантам яе захавання З'яўляецца Расея. Колькі яна будзе падсілкоўваць нашу ўладу, на столькі ўсё можа і расцягнуцца.

А. Адамаў

СПОРТ

В ОЛЬГОВО НОВАЯ СПОРТПЛОЩАДКА

Появление многофункционального комплекса стало возможным благодаря проекту «Добрый спорт», который инициирован Республиканским общественным объединением «Белорусский детский фонд» совместно с сектором спорта и туризма райисполкома.

Еще год назад трудно было представить, что на этом участке можно соорудить нечто подобное. А начиналось все с инициативы молодых родителей, которые обратились в Бабиничский сельский Совет с просьбой определить в агрогородке место для обустройства детской игровой площадки. Своими силами энтузиасты установили беседку, скамейки, качели и песочницу, натянули волейбольную сетку, песком засыпали площадку, один из местных жителей подарил ворота для мини-футбола.

Как нельзя кстати оказалось участие в проекте «Добрый спорт», в рамках которого Республиканским общественным объединением «Белорусский детский фонд» было выделено 8745 долларов США на приобретение и установку уличного спортивного комплекса, теннисного стола, тренажеров, детской горки. Проектом также было предусмотрено окончание строительства скалодрома, совершенствование газона футбольного поля, установка в зоне отдыха столов и скамеек с навесами, установка велопарковки; благоустройство прилегающей территории: высадка саженцев деревьев, установка мусорных урн и скамеек.

Все это было бы невозможным без содействия неравнодушных: ПК «Ольговское» привез несколько машин грунта для подсыпки футбольного поля, большую помощь в благоустройстве прилегающей территории оказали представители Ольговской и Бабиничской школ, РО РОО «Белая Русь», ФСК «Урожай», представители малого бизнеса, отметил начальник сектора спорта и туризма райисполкома Николай Жарненко.

О завершении всех работ пока говорить рано, планируется, что площадка будет дополнена другими элементами, появится и дополнительное освещение, чтобы приверженцы здорового образа жизни могли заниматься здесь спортом и в вечернее время. Торжественное открытие комплекса планируется в рамках масштабного районного спортивного праздника.

— Открытие новой спортивной площадки будет способствовать укреплению здорового образа жизни, даст ребятам возможность совершенствовать свои спортивные навыки, активно развивать их, — подчеркнул Геннадий Сабынич, осматривая объект. — Возможно, именно здесь будут играть будущие чемпионы. Выражаю искреннюю благодарность инициаторам проекта за прекрасный подарок. Наверняка ввод нового объекта даст толчок развитию спорта в районе.

Елена ЧАПЛЕВА
"Жыццё Прыдзвіння"

АБ’ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты “Дзвінскі Ўзгорак“ паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдефануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты “Дзвінскі Ўзгорак“.

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ШТО ВЫВЕЛА СОТНІ ТЫСЯЧ БЕЛАРУСАЎ НА ПЛОШЧЫ?

Паводле афіцыйнай версіі, неаднаразова агучанай адзіным палітыкам (АП), — замежныя лялькаводы. Бо ўнутраных прычын для гэтага ў дзяржаве для народа няма і быць не можа. Прынамсі, асабіста ён іх не заўважыў.



Але калі прызнаць, што такое тлумачэнне ўтрымлівае хоць бы драбніцу ісціны, то ўсіх дзяржаўных прапагандыстаў неабходна тэрмінова звальняць за прафнепрыдатнасць.

Звернемся да бюлетэня «Рэспубліка Беларусь у люстэрку сацыялогіі» за 2018 год, падрыхтаванага спецыялістамі Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра (ІАЦ) пры АП. Салідны дакумент салідных людзей. У мяне няма падставаў яму не давяраць.

Цытую: «На сучасным этапе ў кожнага жыхара краіны ёсць магчымасць аператыўна атрымліваць звесткі пра сітуацыю ў краіне і за мяжой у зручнай для яго форме: на 1 лістапада 2018 года ў краіне дзейнічаюць 9 інфармацыйных агенцтваў, выдаюцца 746 газет і 860 часопісаў, транслююцца дзясяткі тэлеканалаў, ажыццяўляюць вяшчанне 176 радыёпраграм. Шырока прадстаўлены і вэб-сайты, якія публікуюць актуальныя навіны і забаўляльны кантэнт».

Колькасць газет уражвае. Але не будзем цешыць сябе. Не ўсё золата, што блішчыць, і не ўсё карыстаецца попытам, што надрукавана на газетнай паперы. У першай дзясятцы няма ні аднаго незалежнага выдання. А замыкае ТОП-10 газета «Звязда», чыя аўдыторыя (2%) не перавышае хібнасці вымярэння. Што ж тады казаць пра ўплывовасць выданняў, якія ў першую дзясятку не трапілі.

Ад друкаваных выданняў пяройдзем да тэлебачання, якое згодна з прызнаннем сацыёлагаў ІАЦ, «па-ранейшаму застаецца для беларускіх грамадзян галоўнай крыніцай інфармацыі пра падзеі ў рэспубліцы і свеце».

Аднак паводле папулярнасці і ўзроўню даверу, як і ў выпадку з газетамі, тэлеканалы «Белсат» і «Еўраньюс» вядучым дзяржаўным каналам — не супернікі.

Інтэрнэт, безумоўна, апісаную вышэй карціну «змазвае». Праз два-тры гады ён стане для большасці беларусаў галоўнай крыніцай інфармацыі пра падзеі ў краіне і свеце. Стане, але пакуль яшчэ не стаў.

Дык чаму ж лялькаводы з-за мяжы аказаліся настолькі эфектыўнымі пры рэалізацыі сваіх злачынных планаў? А дзе была пры гэтым ідэалагічная вертыкаль?

Выбары і сяржанты

Праўда, як любіць паўтараць палітолаг Станіслаў Бялкоўскі, — гэта версія, якая найбольш задавальняе. У вершнікаў — свая праўда, у пяхоты — свая.

Так, згодна з версіяй кіраўнікоў палатаў беларускага парламента Наталлі Качанавай і Уладзіміра Андрэйчанкі, якой яны падзяліліся са старшынямі парламентаў дзяржаў — чальцоў Еўразаюза, выбары 9 жніўня прайшлі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі РБ.

Наконт колькасці грамадзян, якія рэальна падтрымалі дзеючы курс, у грамадстве ідуць гарачыя спрэчкі. Але, павінен прызнацца, яны мяне мала цікавяць. І тут спатрэбіцца тлумачэнне.

Галасы лічаць на выбарах. Аднак дзе тыя шчаслівчыкі, якія здолелі прыняць удзел у беларускіх выбарах пасля 1996 года? Выбары — гэта ў першую чаргу сумленны падлік галоў. Безумоўна, да такога падліку яны не зводзяцца, але калі сумленны падлік не забяспечаны, то пра якія выбары гаворка?

Каб выпадкова дарэмна не пакрыўдзіць людзей годных, з якіх і камплектуюцца ў Беларусі ўчастковыя выбарчыя камісіі (УВК), я — з дапамогай пісьменніка Габрыэля Маркеса — перанясуся ў Калумбію: «Выбары прайшлі спакойна. У нядзелю, у восем гадзін раніцы, на плошчы была ўстаноўлена драўляная скрыня пад аховай шасці салдат. Галасаванне было цалкам свабодным, у чым Аўрэліяна мог пераканацца сам — амаль увесь дзень ён прастаяў побач з цесцем і сачыў, каб ніхто не прагаласаваў больш за адзін раз. У чатыры гадзіны дня барабанны дроб абвясціў пра канец галасавання, і дон Апалінар Маскотэ апячатаў скрыню ярлыком са сваім подпісам. Увечары, седзячы за партыяй у даміно з Аўрэліяна, ён загадаў сяржанту сарваць ярлык і падлічыць галасы. Ружовых паперак было амаль столькі ж, колькі блакітных, але сяржант пакінуў толькі дзесяць ружовых і папоўніў нястачу блакітнымі. Потым скрыню апячаталі новым ярлыком, а на наступны дзень, ледзь развіднела, адвезлі ў галоўны горад правінцыі» («Сто гадоў адзіноты»).

Беларусь, наколькі мне вядома, знаходзіцца не ў Лацінскай Амерыцы, а ў геаграфічным цэнтры Еўропы. Ці азначае гэта, што мясцовыя сяржанты пазбаўленыя магчымасці ўплываць на падлік галасоў?

Каб знайсці правільны адказ, звернемся да статыстыкі фарміравання УВК. Паводле інфармацыі Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, да 24 чэрвеня было сфарміравана 5 723 участковых выбаркамаў, у склад якіх увайшлі 63 347 чалавек. 3 539 прадстаўнікоў апазіцыйных партый у камісіі ўключылі ўсяго шэсць.

Далей працягваць?

Паміж Богам і Д'яблам

Праўда, як любіць паўтараць палітолаг Станіслаў Бялкоўскі, — гэта версія, якая найбольш задавальняе. Прыведзеная вышэй статыстыка фарміравання УВК многіх у Беларусі задавальняе, і найперш задавальняе яна службоўцаў, што чэрпаюць свае даходы з бюджэтнай кармушкі.

Пазнаць гэтых людзей нескладана. Гэта яны сёння гучней за ўсіх крычаць наконт неабходнасці захавання законаў і палохаюць абывацеляў каляровымі рэвалюцыямі і танкамі NATO, што нібыта вось-вось гатовыя рушыць на Гродна.

Але не перавяліся яшчэ людзі, якія спрабуюць вярнуць праўдзе яе першапачатковую ўніверсальную прыроду. Прапаную прыслухацца да словаў архіепіскапа Гродзенскага Арцемія (Кішчанкі): «…нельга гуляцца з Праўдай, перакручваць яе на карысць палітычнай мэтазгоднасці. Таму што Праўда — гэта той каштоўнасны феномен і сэнсавая катэгорыя, за якой стаіць — БОГ! І калі Праўда бярэцца ў двукоссі і лёгкім рухам рукі ператвараецца ў хлусню, то зневажаецца Той, Хто — Бацька Праўды! І на арэну выходзіць іншы бацька. Бацька хлусні. Якога, як мы ведаем з Божага слова, завуць — Д'ябал. І яшчэ мы пра яго ведаем, што "Ён быў чалавеказабойцам ад пачатку" (Евангелле ад Іаана 8, 44)».

Рэакцыя з боку АП на такі погляд на праўду не прымусіла сябе доўга чакаць: «Мяне здзіўляе пазіцыя нашых канфесій. Дарагія мае святары, пасталейце ды займіцеся сваёй справай. У храмы людзі павінны прыходзіць маліцца! Цэрквы, касцёлы — не для палітыкі. Туды людзі душой павінны прыходзіць, як гэта было заўсёды».

АП перакананы, што святары пайшлі за адшчапенцамі. Галоўнаму спецыялісту па падзеле беларусаў на чыстых і нячыстых, зразумела, лепш бачна. Для тых жа, хто яшчэ не ведае, спатрэбіцца тлумачэнне: адшчапенцы, разам з пацукамі і уркамі — гэта новая генерацыя грамадзян рэспублікі-партызанкі, што на ўсю моц праявіла сябе падчас электаральнай кампаніі.

У іх шэрагі бліжэйшым часам залічаць і святароў, якія адмовіліся «пастаяць». Царква ў Беларусі адасобленая ад дзяржавы, але яна не аддзеленая ад жыцця. У гэтым праблема…

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
"Новы Час"

ІНАЎГУРАЦЫЯ

ПАТАЕМНАЯ ІНАЎГУРАЦЫЯ І «ПРЭЗІДЭНТ — ЦІХАР»

Зранку 23 верасня сталіца Беларусі аказалася спустошанай. Спачатку людзі паведамілі, што да Палацу Незалежнасці — рэзідэнцыі Лукашэнкі, прывезлі роту ганаровай варты. Потым цэнтральныя транспартныя артэрыі Мінска перакрылі ўвогуле.

Відавочна, гэтак рыхтаваліся да «патаемнай інаўгурацыі» Лукашэнкі. Па законе інаўгурацыя павінна прайсці не пазней чым праз два месяцы пасля абвяшчэння вынікаў выбараў. Дзейныя паўнамоцтвы ў Лукашэнкі сканчаюцца 5 лістапада.

Аднак насамрэч гэтая працэдура — інаўгурацыя, — такая ж бессэнсоўная, як і паказальная. Бессэнсоўная — таму што не мае ніякай юрыдычнай моцы, бо парушаная працэдура яе правядзення.

І парушыў яе сам Лукашэнка, які любіць змяняць усё і ўся, дэманструючы сваю ўладу. Яшчэ даўным-даўно ён скасаваў Вышэйшы Гаспадарчы суд, з-за чаго, па вялікім рахунку, трэба мяняць Канстытуцыю, бо згадка пра неіснуючую структуру там засталася. Засталася яна і ў працэдуры інаўгурацыі.

Згодна заканадаўству, «прэзідэнт уступае на пасаду пасля прынясення прысягі… Прысяга прыносіцца ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, суддзяў Канстытуцыйнага, Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага судоў не пазней двух месяцаў з дня выбрання прэзідэнта. З моманту прынясення прысягі нававыбраным прэзідэнтам паўнамоцтвы папярэдняга прэзідэнта спыняюцца».

Такім чынам, прадстаўнікоў скасаванага Вышэйшага Гаспадарчага суду не будзе, а значыць, і прысяга, і працэдура інаўгурацыі — не дзейсныя.

Цікава яшчэ і тое, што «З моманту прынясення прысягі нававыбраным прэзідэнтам паўнамоцтвы папярэдняга прэзідэнта спыняюцца». Калі Лукашэнка прачытаў яе тэкст — усё, ён больш не прэзідэнт. Ён склаў свае мінулыя паўнамоцтвы. Цяпер для цывілізаванага свету ён — звычайны «грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Ён мог бы пабыць прэзідэнтам яшчэ больш за месяц, але… Сам вырашыў. Што зробіш? Нічога.

І, канешне ж, для прынясення прысягі павінна быць «урачыстая абстаноўка». Урачыстую абстаноўку гэтым разам забяспечвалі тысячы сілавікоў, што атачылі Палац Незалежнасці, і прыгонныя людзі, якіх звезлі на мерапрыемства, нават не тлумачачы, што за яно і навошта яны. Пра інаўгурацыю да апошняга маўчалі афіцыйныя СМІ, тэлеграм-каналы і нават прэс-сакратарка самога Лукашэнкі. А дэпутаты ў адзін голас заяўлялі: яны не атрымлівалі запрашэння на інаўгурацыю.

…Чалавек, які «быў абраны 80% выбаршчыкаў», ехаў на інаўгурацыю па спустошаных вуліцах. Падаецца ж — урачыстасць! Але ніводзін чалавек «з народа» не выйшаў (не мог выйсці, напэўна, нават калі б меў такое жаданне) на цэнтральныя вуліцы сталіцы, каб павітаць перамогу таго, за каго ён прагаласаваў. Чаму? Бо, можа быць, за Лукашэнку сапраўды ніхто не галасаваў?

Інтэрнэт адразу ж пачаў кпіць: «Прэзідэнт — ціхар»; «Патаемная інаўгурацыя — выбітная прыкмета 80%-най падтрымкі»; «Вядомы выраз "сам сябе не пахваліш — ніхто і не пахваліць" можна перарабляць на "сам сябе не інаўгуруеш — ніхто не інаўгуруе"»; «І трагічны, і камічны эпізод беларускай гісторыі: чалавек, які сцвярджае, што за яго прагаласавалі 80%, гэта значыць абсалютная большасць, будзе ўступаць на пасаду, хаваючыся ад гэтай самай "сваёй" большасці».

Карацей, гэта была самая клоўнская інаўгурацыя ў гісторыі Беларусі. Відавочна, што насамрэч, «інаўгуруй — не інаўгуруй, усё роўна атрымаеш…» Дакладней, не атрымаеш той самай «усенароднай падтрымкі», якая і надае легітымнасці кіраўніку дзяржавы.

Такім чынам, можна лічыць, што Лукашэнка склаў з сябе паўнамоцтвы прэзідэнта Беларусі. Пакуль што ён яшчэ кіруе — выключна чыноўнікамі і сілавікамі. Уся астатняя краіна яго абраным прэзідэнтам не лічыць. І, з такой інаўгурацыяй — лічыць і не будзе.

Я ж кажу — бессэнсоўнае мерапрыемства.

Сяргей Пульша
"Новы Час"

МІРНЫ ПРАТЭСТ

ЦІ САПРАЎДЫ БЕЛАРУСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ ДЫСКРЭДЫТАВАЛА СТРАТЭГІЮ МІРНАГА ПРАТЭСТУ?

Што тычыцца выніку супрацьстаяньня ў Беларусі, то на яго моцны ўплыў аказала хутчэй умяшаньне Расеі, чым пытаньне суадносін мірных і нямірных мэтадаў.

У расейскай «Новой газете» зьявіўся артыкул палітоляга, дасьледчыка University College of London Ўладзіміра Пастухова «Рэвалюцыя адыходзіць зь Беларускага вакзала. Стратэгія мірнага пратэсту сур'ёзна дыскрэдытаваная ў Менску».

Мірныя і нямірныя рэвалюцыі

Галоўны сэнс артыкула ў тым, што беларускі досьвед паказвае, што эпоха мірных («каляровых») рэвалюцый нібыта заканчваецца, мірным шляхам перамагчы нэататалітарны рэжым (найперш на постсавецкай прасторы) немагчыма.

Тут з самага пачатку хацелася б запярэчыць, што гэтая эпоха закончылася раней. Нямірных рэвалюцый у XXI стагодзьдзі было нямала. У Беларусі дасюль хаваецца былы прэзыдэнт Кіргізстану Курманбек Бакіеў, якога кіргіскае правасудзьдзе імкнецца прыцягнуць да адказнасьці за расстрэл пратэстоўцаў падчас рэвалюцыі 2010 году. Потым была крывавая «арабская вясна», у выніку якой рэвалюцыі ў Лібіі, Сырыі, Эгіпце выліліся ў грамадзянскія вайны. І кульмінацыяй нямірнай рэвалюцыі быў украінскі Майдан 2014 году.

Таксама няма нічога эксклюзіўна беларускага і ў тым, што за доўгі час панаваньня рэжыму Лукашэнкі тут сфармавалася асобная кіроўная кляса, якая «зьяўляецца калектыўным бэнэфіцыярам» мадэлі дзяржаўнага капіталізму ў Беларусі. Любая палітычная сыстэма ў любой краіне, асабліва калі яна доўга існуе, фармуе сацыяльны слой, на які яна абапіраецца і які становіцца яе бэнэфіцыярам.

Велізарная роля дзяржавы

Асаблівасьці беларускай сытуацыі, якія тлумачаць моц існага рэжыму і часткова ягоную жорсткасьць, палягаюць у іншым. Найперш тут замацавана велізарная роля дзяржавы ў эканоміцы, сацыяльнай сфэры, грамадзтве ўвогуле. У значнай ступені гэта савецкая спадчына. Такога ўсёахопнага дзяржаўнага кантролю няма ў іншых аўтарытарных рэжымах XXI стагодзьдзя. Беларусь тут можна параўнаць хіба што з Кітаем.

Дык вось, гэты дзяржаўны монстар, Левіяфан, стварае сытуацыю, калі кантролем за палітычнай лаяльнасьцю грамадзян і палітычнымі рэпрэсіямі займаюцца ня толькі праваахоўныя органы і спэцслужбы, але і ўсе дзяржаўныя ўстановы.

На гэта працуе ўся сыстэма адукацыі. Пра ролю настаўнікаў у фальсыфікацыі выбараў не пісаў толькі лянівы. Загадчыцы дзіцячых садкоў пагражаюць забраць дзяцей у бацькоў, якія ходзяць на мітынгі. На дзяржпрадпрыемствах функцыянуе кантрактная сыстэма, якая дазваляе хутка пазбаўляцца ад неляяльных бунтароў. Дзяржаўныя правайдэры блякуюць інтэрнэт. Дзяржаўныя ЖЭСы адключаюць сьвятло ў непажаданых офісах (краме Symbal.by Паўла Белавуса), зафарбоўваюць непажаданыя надпісы на сьценах. І так далей.

Такі татальны ахоп быў бы немагчымы, калі б у краіне існаваў вялікі недзяржаўны сэктар ня толькі ў эканоміцы, але і ў сацыяльнай сфэры. Дарэчы, гэта адна з галоўных прычын, чаму Лукашэнка так упарта трымаецца за дзяржаўны сэктар і не дапускае прыватызацыі.

У Беларусі апазыцыя пазасыстэмная

Другі момант. У пераможных «каляровых рэвалюцыях» у Югаславіі, Грузіі, Украіне (у «недарэвалюцыі» ў Вэнэсуэле) апазыцыя мела вялікія плацдармы ў палітычнай сыстэме. Яна прысутнічала ў парлямэнце, органах мясцовага самакіраваньня. Цэлыя рэгіёны ўзначальваліся апанэнтамі кіроўных рэжымаў.

У Беларусі ў гэтым пляне палітычная сыстэма абсалютна стэрыльная. Няма ніводнай выспы, ніводнага лапіка, які б мела апазыцыя ў палітычнай сыстэме. Тут жорсткі кансалідаваны рэжым, а апазыцыя чвэрць стагодзьдзя абсалютна пазасыстэмная. У гэтым таксама палягае моц рэжыму. Дзяржаўныя інстытуты абсалютна незалежныя ад грамадзтва. Таму маральна-псыхалягічны ціск народнага пратэсту на іх пакуль не прыносіць плёну.

І апошняе, цесна зьвязанае з папярэднім. Цягам чвэрці стагодзьдзя ня толькі дзяржаўныя мэдыя, але і ўся сыстэма ідэалягічнай працы займаецца татальнай дэманізацыяй праціўнікаў рэжыму. Афіцыйны ідэалягічны канструкт даводзіў, што ўвесь народ падтрымлівае Лукашэнку, для апазыцыі няма сацыяльнай базы, ёсьць толькі купка «адмарозкаў», замежных агентаў. То бок з 1990-х гадоў краіна існуе ў стане халоднай грамадзянскай вайны. Гэта часткова тлумачыць тую жорсткасьць, якую дэманструюць сілавыя структуры падчас задушэньня народнага пратэсту.

…Што тычыцца выніку супрацьстаяньня, то на яго больш уплывае хутчэй умяшаньне Расеі, чым пытаньне суадносін мірных і нямірных мэтадаў.

Валер Карбалевіч
Навіна з сайта: www.svaboda.org

ЭКАНОМІКА

ЧТО БУДЕТ С ЭКОНОМИКОЙ ПОСЛЕ ПРОТЕСТОВ?

Поговорили с финансовым менеджером Сергеем Королем, о том, какое будущее ожидает белорусскую экономику в результате протестов и как из похожих ситуаций выходили другие страны в разное время. Сергей получил степень магистра в университете Джонса Хопкинса по специальности «Международная экономика и финансы», он также имеет степень Executive MBA института INSEAD и сертификат CFA (Chartered Financial Analyst).

Сценарий 1. В Беларуси без изменений: власть остается прежней, помогает Россия

— Какие бы аналогии мы ни проводили с другими странами, они все равно будут отличаться. Но можно попробовать: например, с ходу приходят на ум две ситуации, которые вообще не вписываются в картину, поскольку то был период социализма. Это протесты в Чехии в 1968 году и в Польше в 1980-м, которые в обоих случаях не увенчались успехом: победило правительство с помощью внешних сил — Советского Союза.

Но интересно, что те же внешние силы, которые помогали подавлять протесты, в итоге были заинтересованы, чтобы в этих странах наступила стабильность. Поэтому в дальнейшем Советский Союз оказывал и экономическую помощь своим ставленникам в Чехословакии и Польше.

Если все закончится победой режима Лукашенко, то, наверно, это и есть самая близкая аналогия. Ведь тогда будет оказана со стороны России экономическая поддержка прежде всего в пользу режима.

В этой ситуации совершенно понятно, что будет сделано: Россия даст основательный кредит, измеряемый не миллионами, а миллиардами; могут восстановить схему субсидирования переработки нефти без тарифных обложений; могут сделать капитальные инвестиции в определенные предприятия (например, те, где наблюдался больший уровень недовольства) — все это вполне возможно. Но не бесплатно — ценой этому станет потеря суверенитета.

И с экономической точки зрения вполне возможно, что в Беларуси восстановление наступит очень быстро. Просто потому, что по отношению к экономике страны это достаточно большие объемы поддержки. Тогда, я бы сказал, возникнет не просто нормализация ситуации, но даже что-то похожее на подъем.

Правда, этот подъем будет иметь совершенно другую структуру: не такую, как в последние пять лет, когда такие элементы развития и роста в экономике Беларуси происходили из секторов будущего, связанных с интегрированием страны в глобальные процессы. Этот подъем станет временным и будет происходить из старых секторов (промышленный сектор советского периода), потому как новый сектор закроется, уедет, прекратит свое существование до тех пор, пока не возникнут благоприятные условия.

Сценарий 2. В Беларуси без изменений: власть остается прежней, но мы идем по пути Китая

Еще один пример и возможный сценарий развития — это Китай после восстания на площади Тяньаньмэнь. Изначально оно было подавлено, а затем, я бы сказал, и обезоружено. Китайские власти нашли возможности выпустить пар из движения протеста — и оно просто прекратилось так же спонтанно, как и началось.

Но вот что произошло в результате восстания: знаменитое китайское развитие, либерализация экономической жизни и интеграция страны в мировую экономику случилось именно после площади Тяньаньмэнь. Да, началось все раньше — за 10 лет «до», но достигло своего апогея уже по завершении этих событий.

Такой сценарий возможен и у нас, но его трудно себе представить в условиях Беларуси из-за внешнего фактора: для нас это возможно только в том случае, если каким-то образом будет найден хоть какой-то компромисс и сам режим осознает, что он не хочет впадать в зависимость от Москвы, а пожелает вернуться на путь развития.

Плюс отличие Беларуси от Китая в этой ситуации в том, что у последнего на тот момент было партнерство с крупнейшей экономикой мира — его уже тогда поддерживали США. А у белорусского режима партнерства нет ни с кем, кроме России.

Другие примеры сложно приводить, потому что всегда в таких ситуациях решающую роль играет то, что происходит после подобного политического кризиса. Допустим, в Европе после глобального финансового кризиса (2010-2011 годы) тоже было очень много недовольства — особенно в южных странах.

Но все это государства с относительно функционирующим демократическим процессом и без такого решающего внешнего влияния. В них произошло восстановление экономики вполне нормальным путем: сначала все упало, а потом по логике спроса и предложения постепенно восстановилось — в каждой из стран в разной степени.

Времени на это было потрачено тоже по-разному: в Испании быстрее — меньше чем 2 года, в Греции этот процесс занял 8 лет. Латвия в то время упала в полный штопор на 6 месяцев, но так же быстро из него и выбралась, потому что были быстро приняты очень крайние меры в виде шоковой терапии, которые и подействовали. Они могли себе это позволить, потому как страна ценит свою независимость и люди были готовы на все, чтобы ее сохранить.

В странах, в которых кризис вызван в первую очередь политическими причинами, как в Беларуси, пути выхода из него зависят от того, какой сценарий возьмет верх в решении противостояния в стране.

Сценарий 3. В Беларуси все изменилось: протестующие взяли свое

Есть большая вероятность, что будет так, как Лукашенко и сказал: все войдет в экономический штопор. И во время этого есть серьезный риск разграбления государственной собственности внутренними и внешними силами, главные участники которых — приближенные к власти люди. Это, скажем так, украинский сценарий развития ситуации.

Как заметил немецкий экономист Даниэль Крутцинна, в этом случае российское направление перекроется: цены на энергоносители станут мирового уровня, все преференции отпадут, возможно будут даже введены санкции, как минимум торговые. Тогда старая экономика пострадает еще больше, и все будет делаться так, чтобы представители российских сил получили ее за бесценок.

В данном случае потребуется очень большая поддержка со стороны европейских кругов. А как ее получить стране, которая даже не является членом ЕС? Этот очень привлекательный сценарий с точки зрения политики экономически рискованный. И как раз в этом случае можно ожидать масштабного кризиса.

Гражданское общество Беларуси удивило весь мир уровнем своей самоорганизации, но все-таки ее при подобном сценарии развития может не хватить, чтобы предотвратить крупное перераспределение собственности. Ведь в нем будут задействованы очень корыстные и мощные внешние, а также внутренние интересы.

Сейчас последние боятся того, что их самих посадят, а в условиях демократии этот элемент страха уйдет, и тогда они смогут достаточно быстро получить доступ к реальным активам. И в этой ситуации возможно и падение ВВП, и падение цен на собственность — продавать придется за бесценок, потому как иначе ее никто не купит.

(скарочана)

Новость с сайта: gazetaby.com

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 29.09.2020 у 16.16
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.